Belarus

# ЗАКОН АБ ЗАРАБОТНАЙ ПЛАЦЕ Ў СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРЦЫ (ШАТЛАНДЫЯ) 1949 г.

## Мінімальныя пагадзінныя стаўкі заработнай платы і стаўкі за звышурочную працу, аплатны адпачынак, права на аплату бальнічнага і водпуск у сувязі са смерцю члена сям'і для работнікаў сельскай гаспадаркі Шатландыі

## Для ўсіх работнікаў, занятых у сельскай гаспадарцы

| Мінімальная пагадзінная стаўка заработнай платы з 1 красавіка 2024 г. | |
|---|---|
| Усе ўзросты | 10,42 фунта стэрлінгаў |

| Мінімальная стаўка аплаты за звышурочную працу з 1 красавіка 2024 г. | |
|---|---|
| Звышурочныя выплачваюцца ўсім работнікам за:<br>(a) кожную гадзіну працы звыш 8 гадзін у дзень, або<br>(b) усім работнікам, якія працуюць пастаянна цягам перыяду да 26 тыдняў, за кожную гадзіну працы звыш 48 гадзін цягам аднаго тыдня (акрамя гадзін, якія мусяць аплачвацца згодна з п. (a) вышэй і будуць разлічвацца паводле формулы M x 1,5, дзе M адпавядае мінімальнай пагадзіннай стаўцы);<br>(c) усім работнікам, якія працуюць пастаянна цягам перыяду больш за 26 тыдняў, за кожную гадзіну працы звыш 39 гадзін цягам аднаго тыдня. | |
| Усе ўзросты | 17,16 фунта стэрлінгаў |

### Даплата на ўтрыманне сабак

З 1 красавіка 2024 г. даплата на ўтрыманне сабак будзе складаць 9,36 фунта стэрлінгаў на тыдзень за кожнага сабаку, але з разліку не больш чым на 4 сабакі.

### Аплатны адпачынак

Умовы аплатнага адпачынку і пазачарговага адпачынку для ўсіх работнікаў сельскай гаспадаркі прадугледжаныя ў Частцы 4 (Артыкулы 10-15) Загаду. Палажэнні аб адпачынку адпавядаюць умовам Рэгламенту працоўнага часу 1998 г. з улікам змяненняў, унесеных Рэгламентам працоўнага часу (са змяненнямі) 2001 г.

### Дадатковая сума

З 1 красавіка 2024 г. дадатковая сума ў памеры не менш за 1,71 фунта стэрлінгаў/гадзіну выплачваецца тым работнікам, якія маюць шатландскае або нацыянальнае пасведчанне аб прафесійнай кваліфікацыі ў галіне сельскай гаспадаркі/садаводства з узроўнем SCQF 6 ці вышэй; пасведчанне аб навучанні і атэстацыі, зацверджанае арганізацыяй "Lantra Awards" (раней – "ATB Landbase"); або пасведчанне аб набытым вопыце, выданае Нацыянальнай арганізацыяй падрыхтоўкі "ATB Landbase".

### Права на аплату бальнічнага

Умовы, якія датычацца права на аплату бальнічнага для тых работнікаў сельскай гаспадаркі, якія пастаянна працуюць у аднаго працадаўцы не менш за 52 тыдні, прадугледжаныя ў Частцы 5 (Артыкулы 16-19) Загаду.

### Іншыя палажэнні

Палажэнні, якія датычыцца Пагаднення аб стабільным заробку, дапамозе і водпуску ў сувязі са смерцю члена сям'і, застаюцца без змяненняў. Падрабязная інфармацыя змешчаная ў Загадзе.

**ЗАЎВАГІ**

1. Вышэйназваныя мінімальныя стаўкі заработнай платы набываюць моц з 1 красавіка 2024 г. Загад не ўжываецца ў дачыненні да асобаў "школьнага ўзросту" згодна з раздзеламі 31 і 33 Закона аб адукацыі (Шатландыя) 1980 г.
2. У прымяненні да вышэйзгаданых ставак працоўны час не ўлічвае перапынак на абед, але ўлічвае час, калі з прычыны ўмоў надвор'я або з іншых прычын працадаўца не дазваляў працаваць работніку, які быў гатовы да працы.
3. Прэтэнзіі з нагоды нявыплаты прадугледжаных мінімальных ставак заработнай платы і невыканання ўказанняў адносна аплатнага адпачынку належыць накіроўваць Ураду Шатландыі, галіна D, аддзел заработнай платы ў сельскай гаспадарцы па адрасе: Сотан Хаўс, Брумхаўс Драйв, Эдынбург EH11 3XD (Saughton House, Broomhouse Drive, Edinburgh EH11 3XD).
4. Шатландскі савет па заработнай плаце ў сельскай гаспадарцы працягвае ў цэлым падтрымліваць канцэпцыю агульнабрытанскай пенсіённай праграмы для работнікаў сельскай гаспадаркі.
5. З 1 красавіка 2024 г. абмежаванне на вылік за пражыванне (акрамя дома) будзе складаць 9,99 фунта стэрлінгаў/дзень.

УВАГА: вышэйпрыведзеныя звесткі – гэта толькі сціслы змест Загаду. Для атрымання падрабязнай інфармацыі аб палажэннях неабходна звярнуцца да Загаду аб заработнай плаце ў сельскай гаспадарцы № 71 і спадарожнага Даведніка, асобнікі якога можна па запыце атрымаць ад Сакратара Шатландскага Савета па заработнай плаце ў сельскай гаспадарцы, які знаходзіцца па адрасе: Сотан Хаўс, Брумхаўс Драйв, Эдынбург EH11 3XD (Saughton House, Broomhouse Drive, Edinburgh EH11 3XD), (нумар тэлефона: 0131 244 9749). Эл. пошта: sawb@gov.scot



"Эй-Пі-Эс Груп Скотланд" (APS Group Scotland) (02/24)